3. Лобанов, А. П. XXI век: когнитивный агент в открытом инновационном образовательном пространстве / А. П. Лобанов, Н. В. Дроздова // Вышэйшая школа. – 2017. – № 1. – С. 28–31.
4. Журавков, М. А. Высшее образование. Университет будущего… / М. А. Журавков // Вышэйшая школа. – 2017. – № 1. – С. 3–15.
5. Виртуальная образовательная среда вуза как фактор личностно-профессионального развития будущего специалиста / О. Л. Жук, С. Н. Сиренко // Педагогическата среда в университета като пространство за професионално-личностно развитие на бъдещия специалист: в 2 т.: сб. науч. ст.: – Габрово, ЕКС-ПРЕС. – Т. 1. – С 133–137.
6. Лобанов, А. П. Квантование учебных текстов как преодоление транзактной дистанции субъектов образовательного процесса / А. П. Лобанов, И. С. Журавкина // AiB – № 10. – 2018. – С. 44–52.

УДК 372.882

# ДЫДАКТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ ГЛОГ-ТЭХНАЛОГІІ Ў ШКОЛЬНАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ АДУКАЦЫІ

*Т. В. Кароза*
*БДПУ імя М. Танка (Мінск)*

Ключавыя словы: глог-плакат, інтэрактыўны электронны плакат, графічны блог, беларуская літаратура.

Анатацыя. Прадстаўлены вопыт прымянення новых інтэрактыўных спосабаў навучання – глог-тэхналогій – на ўроках літаратуры ў старэйшых класах. Прааналізаваны формы работы з дадаткам «Glogster» выяўлены дыдактычны патэнцыял глог-тэхналогій на ўроках беларускай літаратуры.

# DIDACTIC POTENTIAL OF GLOG TECHNOLOGY IN SCHOOL LITERARY EDUCATION

*T. V. Koroza*
*BSPU named after M. Tank (Minsk)*

Keywords: glog poster, interactive electronic poster, graphic blog, Belarusian Literature.

Abstract. The experience of applying new interactive teaching methods – glog technology – in literature lessons in senior classes is presented. Forms of work with the application «Glogster» are analyzed, the didactic potential of glog technologies in the lessons of Belarusian Literature is revealed.

XXI стагоддзе цесна звязана з развіццем інфармацыйных сеткавых тэхналогій, якія літаральна пранікаюць ва ўсе сферы грамадскага жыцця. У выніку інтэнсіўнага пашырэння сеткавай прасторы ўмовы для ўстаноў адукацыі ў сучасную эпоху істотна змяніліся. Ідзе актыўны пошук шляхоў для павышэння якасці адукацыйнага працэсу, якi накіраваны на фарміраванне адукацыйных вынікаў на аснове выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій. Для гэтага настаўніку прыходзіцца не толькі асвойваць сучасныя метады падачы матэрыялу, але і ствараць наглядна-дыдактычныя дапаможнікі новага пакалення.

Адным з іх з'яўляецца інтэрактыўны электронны плакат (глог (glog), або графічны блог (graphical blog). Дадзены плакат выконваецца ў выглядзе арыгінальных прэзентацый па канкрэтнай тэме і валодае магчымасцю ўтрымліваць у сваім змесце не толькі тэкставыя і графічныя дадзеныя, але і аўдые-, і відэаматэрыялы, малюнкі і анімацыю.

Глог (ад англ. graphical – "графічны" і blog – "блог") – гэта мультымедийная вэб-старонка або мультымедыйны постэр, на якім могуць быць размешчаны тэксты, фота, відэа-, аўдыефайлы, графічныя элементы, спасылкі і мн. інш. Іх можна выкарыстоўваць на любых рэсурсах, якія прымаюць html-коды. Колькасць глогаў расце з кожным днем, іх налічваецца каля 10,4 мільенаў» [1].

Мы прывыклі да інтэрактыўных плакатаў, якія выконваюцца па сродкам офіснага дадатка MS PowerPoint, але такія прэзентацыі інтэрактыўныя ў межах камп'ютара. У адрозненне ад прэзентацыі глог характарызуецца магчымасцю нелінейнага выкарыстання, інтэрактыўнасцю – здольнасцью рэагаваць на дзеянні карыстальніка. Вучэбны глог-плакат павінен адпавядаць пэўнай тэме, што вывучаецца, але пры гэтым ен не толькі раскрывае тэму ўрока, а і дазваляе праверыць яе засваенне, адпавядае ўзроставым асаблівасцям вучняў, гігіенічным патрабаванням, мае простую і зручную навігацыю.

Галоўная функцыя інтэрактыўнага плаката – забяспечыць высокі ўзровень нагляднасці, прычым інфармацыя прадстаўляецца не адразу, а раскрываецца ў адпаведнасці з дзеяннямі карысталь-

ніка, што, акрамя ўсяго іншага, яшчэ і дазваляе вар'іраваць глыбіню пагружэння ў тэму.

Ствараць глогі можна з дапамогай сервера Глогстэр (Glogster). Гэта адна з папулярных сацыяльных сетак, якую выкарыстоўваюць у адукацыйных мэтах. Glogster забяспечвае асяроддзе для распрацоўкі інтэрактыўных плакатаў. Карыстальнік устаўляе тэкст, выявы, фатаграфіі, аудые (MP3), відэа, спецэфекты і іншыя элементы ў glogs для стварэння мультымедыйных плакатаў. Карыстальнікі могуць інтэграваць дынамічныя практыкаванні і мульты-сэнсарныя рэсурсы. Glogster EDU дазваляе настаўнікам і вучням выкарыстоўваць glogs у якасці вучэбных дапможнікаў і дзяліцца сваімі Glogs ў прыватным віртуальным класным пакоі.

Для арганізацыі работы на ўроку беларускай літаратуры на гэтым сэрвісе можна стварыць віртуальнае падарожжа па мясцінах, дзе жыў і творча рэалізаваў сябе пісьменнік (Літаратурная вандроўка «Сцежкамі дзяцінства Якуба Коласа»); праілюстраваць аповед пра вядомую асобу, культурнага дзеяча («Асветніцкая дзейнасць выдатнага мужа Полацкай зямлі»); стварыць інтэрактыўны расказ пра кнігі аднаго аўтара з адсканіраванымі ілюстрацыямі вучняў і інш.

Дадзены Інтэрнэт-рэсурс можна выкарыстоўваць для абагульнення і сістэматызацыі ведаў па пэўнай тэме. З гэтай мэтай вучням прапануецца самастойна скласці міні-канспект, запоўніць глог-плакат тэкставымі матэрыяламі, малюнкамі, аўдые- і відэазапісамі, прымацаваўшы спасылкі на Інтэрнэт-крыніцы.

Пры дапамозе дадзенага сэрвісу можна стварыць канспект мультымедыйнага ўрока са спасылкамі на матэрыялы, відэафрагменты і аўдыезапісы; інтэрактыўную біяграфію пісьменніка; віртуальнае падарожжа па старонках кнігі, па цікавых мясцінах свайго рэгіену.

Вучням, якія працуюць з гэтым сэрвісам, можна даваць такія заданні, як падабраць матэрыялы ў Інтэрнэце (відэафрагменты, ілюстрацыі ці фотаздымкі) для размяшчэння на канкрэтным плакаце; запісаць гукавое паведамленне, якое можа быць пачаткам пэўнай гісторыі; пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка стварыць інтэрактыўны аповед са спасылкамі.

Гатовымі гісторыямі можна дзяліцца ў сацыяльных сетках і атрымаць код для прымацавання на сайт ці блог. Створаныя матэрыялы нельга захоўваць на камп'ютар для дэманстрацыі оффлайн.

Выкарыстанне Glogster як адной з перспектыўных інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій у навучанні дапамагае педагогу вырашыць наступныя дыдактычныя задачы [4]:

1) павышэнне інтэнсіўнасці навучальнага працэсу;

2) стымуляванне разумовых і творчых здольнасцей вучняў;

3) «уцягванне» ў адукацыйны працэс адсталых і безыніцыятыўных вучняў;

4) забеспячэнне школьнікаў сучаснай вучэбнай інфармацыяй;

5) навучанне навыкам самастойнай працы з рознымі крыніцамі інфармацыі, уменню аналізаваць, вылучаць галоўнае, ацэньваць праўдзівасць або памылковасць інфармацыі. Развіцце лічбавай кампетэнтнасці. Падрыхтоўка да жыцця ў сучасным інфармацыйным грамадстве;

6) увасабленне асобасна арыентаванага шляху да навучання;

7) актывізацыя працэсу навучання;

8) стварэнне стабільнай самаматывацыі.

У якасці прыкладу прывядзем магчымасць прымянення глог-плаката на ўроку беларускай літаратуры ў 6 класе пры вывучэнні тэмы «У свеце загадак і цудаў».




*Малюнак 1 – Выява верхняй часткі глог-плаката*




*Малюнак 2 – Выява ніжняй часткі глог-плаката*

Глог-плакат утрымлівае тэму, мэту ўрока, імя педагога, які стварыў яго, выявы некаторых духаў старажытных славян, пра якія пойдзе гаворка на ўроку. Таксама на глог-плакаце можа быць размешчана відэапрэзентацыя «Богі старажытных славян», падчас прагляду якой шасцікласнікам неабходна запісаць імены старажытных славянскіх багоў у той паслядоўнасці, у якой яны падаюцца [3].

На адным з этапаў урока вучні расказваюць легенды і паданні, звязаныя з узнікненнм назвы свайго роднага мястэчка.

На выніковым этапе ўрока прапаноўваецца вучням пагледзець фотамастацкі праект (відэапрэзентацыя), удзельнікамі якога сталі вядомыя асобы ў культурным жыцці Беларусі.

Такім чынам, дыдактычны патэнцыял глог-плакатаў на ўроках літаратуры дае магчымасць не толькі крочыць «у нагу з часам», адпавядаць модзе, але і спрыяе фарміраванню ключавых кампетэнцый школьнікаў для жыцця ў сучасным свеце, дапамагае лягчэй успрымаць вучэбны матэрыял і ў той жа час дазваляе настаўніку зацікавіць сваіх вучняў беларускай літаратурай, навучыць граматнай рабоце з тэкстам і прывіць навыкі аналітычнай працы.

Літаратура

1. Артамонова, И. В. Glogs как средство активизации учебной деятельности обучающихся // Урок. РФ. [Электронный ресурс]. – 2017. – Режим доступа: https://урок.рф/library/glogs_kak_sredstvo_aktivizatcii_uchebnoj_deyatelnost_155053. – Дата доступа: 10.03.2020.

2. Запрудский, Н. И. Современные школьные технологии / Н. И. Запрудский. – Минск: Сэр-Вит, 2010. – 256 с.

3. Казачэнка, І. Р. Практычнае выкарыстанне Web 2.0 сэрвісаў інтэрнэту на ўроках беларускай літаратуры / І. Р. Казачэнка [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: http://www.academy.edu.by/files/e%20konf%20bel%202016/Kazachenko%20bel.pdf. Дата доступа: 25.02.2019.

4. Современная школа: опыт модернизации : книга для учителя / Е. В. Тряпицына [и др.] ; под общ. ред. А. П. Тряпицыной. – СПб. : Изд-во РГПУ им. А. И. Герцена, 2005. – 290 с.

УДК 377

# ОСОБЕННОСТИ ПРОФЕССИОНАЛЬНО-ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ МОТИВАЦИИ УЧАЩИХСЯ-БУДУЩИХ ПЕДАГОГОВ ДОШКОЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

*В. М. Ланевская*
*БГПУ им. М. Танка (Минск)*

Ключевые слова: профессиональное обучение, педагог дошкольного образования, мотивация, профессионально-педагогическая мотивации, образовательный процесс.